*А.І.Непачаловіч, ст.выкладчык*

# ВЫЯЎЛЕННЕ АСАБЛІВАСЦЕЙ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ПАДВОЙНЫХ ДЫВАНОЎ

Цудоўным скарбам Заходняй Беларусі з'яўляюцца адметныя па кампазіцыйна-арнаментальнай структуры і тэхналагічна складаныя народныя двухасноўныя двухслойныя тканіны, якія атрымалі ў пачатку XX ст. назву «гродзенскія дываны». На жаль, зараз яны амаль адыходзяць у нябыт.

Гродзенскія падвойныя дываны выкарыстоўваліся для аздаблення касцёлаў і хатняга ўжытку. У касцёлах іх клалі на падлогу ля алтара, а ў хатнім інтэр'еры імі засцілалі ложак, стол і куфры. Двухасноўныя тканіны выкарыстоўваліся замест папоны на конях.

Найчасцей тканыя ў падвойнай тэхніцы дываны, посцілкі і настольнікі прызначаліся для абрадаў. Настольнікі выкарыстоўваліся ў дні сямейных і рэлігійных свят. Пры вясельных абрадах на прыгожы падвойны дыван клалі ручнік. У час вянчання на такім дыване стаялі жаніх і нявеста. Вясельныя дываны зберагалі як сямейную рэліквію і перадавалі ў спадчыну дачкам. Дываны прызначаліся і для пахавальных абрадаў. З канца XIX ст. іх пачалі вырабляць на продаж.

Узнаўленне старадаўняй традыцыі падвойнага ткацтва патрабуе не толькі вывучэння гісторыі яго ўзнікнення і развіцця, але і абавязковага вызначэння мастацкіх якасцей. Падвойным дыванам характэрна разнастайнасць кампазіцыйных вырашэнняў. Сярод іх сустракаюцца падвойныя тканіны з шырокімі і вузкімі бардзюрамі, з вялікімі і малымі палямі пасярэдзіне.

Характэрнай рысай гродзенскіх дываноў з'яўляецца разнастайнасць арнаментальных матываў. Выявы чалавечых фігур, птушак, раслін, жывёл, а таксама ўпрыгожванне іх рознымі па змесце тэкстамі ўяўляюць адну з традыцый народнага мастацтва Беларусі.

Падвойныя тканіны, якія выкарыстоўваліся для аздаблення, былі больш простыя, малюнак меў рытмічны паўтор. На пахаванні ўжываліся тканіны вельмі стрыманыя па колеры і малюнку (чорна-карычневыя ці чорна-зялёныя).

Найбольш цікавымі з'яўляюцца вясельныя дываны. Для іх характэрныя шырокія і вузкія бардзюры, дзе размешчаны разеткі,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

кветкі, вінаградныя гронкі і інш. У цэнтры звычайна – выявы вясельных карагодаў, закампанаваных гарызантальна або вертыкальна ўздоўж бардзюра. Фігуркі людзей, як і ў старажытнасці, вытканыя ў фас, мяжуюцца з фігуркамі птушак і жывёл, паказаных у профіль. На многіх вясельных дыванах ёсць сілуэты светлых фігурак хлопца і дзяўчыны. Маладыя трымаюцца за рукі. Яны з'яўляюцца сімваламі шлюбу. Коні, козы, авечкі і птушкі – сімвалы міру, шчасця і дабрабыту.

Часта на дыванах сустракаецца матыў дрэва жыцця. Па цэнтральным полі некаторых дываноў раскіданы зоркі («рачкі»). Яны азначаюць шчаслівую будучыню маладых. Колькасць і месца іх размяшчэння на фоне дывана мела сваё значэнне.

На пераборныя тканіны Гродзеншчыны (асабліва посцілкі і дываны) моцна ўплывалі дываны. У стварэнні вырабаў у пераборнай тэхніцы вельмі часта выкарыстоўваюцца кампазіцыйныя прыёмы, уласцівыя менавіта двухасноўным падвойным тканінам. У іх сустракаюцца сюжэтныя матывы з выявамі птушак, жывёл і фігурак людзей, характэрныя для арнаментальных матываў гродзенскіх дываноў.

Для гэтых дываноў уласціва залаціста-чорная, чорна-чырвоная, зялёна-бардовая, карычнева-сіняя каляровая гама. Часцей за ўсё спалучаюцца чырвона-цагляны і залаціста-жоўты колеры розных адценняў зялёнага з чорным. Вырабы аздабляюцца махрамі з двух, трох ці чатырох бакоў.

Адметнай рысай падвойных (двухасноўных) тканін з'яўляецца іх структура. Такія тканіны тоўстыя, шчыльныя, у іх вылучаюцца два слоі, якія адрозніваюцца па колеры і пранікаюць адзін у аднаго ў месцах спляцення ўзору. Сваёй двухслойнасцю яны абавязаны падвойнай двухкаляровай аснове і падвойнаму (у тым самым колеры, што і аснова) утку. Падвойныя дываны ткуцца простым палатняным пляценнем на гарызантальных кроснах у чатыры ніты. Узор набіраецца пры дапамозе драўлянай ліштвачкі-бральніцы праз падняцце паверх асновы ніжняга слою, які мае кантрастны колер у адносінах да верхняга. Гэткім чынам рэверс тканіны робіцца негатывам ад аверсу. Адручны набор узору – гэта вельмі карпатлівая праца, але яна дазваляе ткачысе павольна кампанаваць арнамент і выконваць складаны малюнак.

Памер падвойных дываноў вагаецца ў межах 1,5 м шырыні, 2 м даўжыні. Іх выраблялі на вузкіх кроснах і сшывалі пасярэдзіне, аднак зрэдку найбольш вопытныя ткачыхі ткалі і на шырокіх станках. Дываны вялікіх памераў ткаліся па фрагментах. У

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

фрагментах улічвалася кампазіцыйнае вырашэнне ўсяго вырабу. Гэтыя тканіны прызначаліся для інтэр'ераў царквы ці касцёла.

Адраджэнне і развіццё падвойнага ткацтва немагчыма без грунтоўнага яго вывучэння. Вялікую ўвагу даследаванню асаблівасцей самабытных нацыянальна-характэрных двухасноўных дываноў Беларуска-Польскага памежжа надаюць кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУ культуры і мастацтваў і аўтар гэтага артыкула. Вынікі навукова-даследчай і навукова-эксперыментальнай работы выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання студэнтаў у майстэрні мастацкага ткацтва.

Выяўленне і вывучэнне асаблівасцей вырабаў падвойнага ткацтва дапамагаюць у вырашэнні праблемы захавання эстэтычных і мастацкіх каштоўнасцей гродзенскіх дываноў і далейшым развіццi старадаўняй традыцыі вырабу двухасноўных тканін.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ